*Афіцыйна*

# Інтэлектуальная скарбніца

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў дзень рэспубліканскага суботніка мае намер наведаць месца ўзвядзення новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі і асабіста азнаёміцца з ходам работ. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы паведаміў у ходзе нарады па пытаннях будаўніцтва галоўнай інтэлектуальнай скарбніцы краіны.*

«Я ўбачу будоўлю і змагу задаць пытанні рабочым, прарабам, начальніку будаўніцтва, старшыні Мінгарвыканкома. Я хацеў бы атрымаць аб'ектыўную інфармацыю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што да ўводу ў эксплуатацыю новага будынка застаецца чатыры з паловай месяцы, і «часу на раскачванне няма». Закранаючы пытанне фінансавання будаўнічых работ, Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў прадставіць яму абгрунтаванне просьбаў урада аб выдзяленні дадатковых сродкаў.

Закупка камп'ютэрнага і тэхналагічнага абсталявання для новага будынка ыацыянальнай бібліятэкі павінна ажыццяўляцца на тэндэрнай аснове, заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Галоўнае, каб усё было сумленна і адкрыта. Чым танней, тым лепш, але неабходна ўлічваць і якасць», — падкрэсліў ён на нарадзе. Адзначыўшы, што новы будынак інтэлектуальнай скарбніцы краіны павінен адпавядаць сусветным стандартам не толькі па архітэктуры, але і па свайму тэхналагічнаму аснашчэнню, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што пытанні набыцця абсталявання дагэтуль ве вырашаны.

Па стану на 1 красавіка 2005 года з пачатку будаўніцтва аб'екта, якое стартавала ў лістападзе 2002 года, на аплату работ і закупку неабходных матэрыялаў і абсталявання накіравана 161,8 мільярда рублёў. Аб'ём асвоеных капітальных укладанняў — 92,4 мільярда рублёў.

БЕЛТА.